Эвалюцыя судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі (1772–1917 гг.)

СУДОВАЯ СІСТЭМА, СУДАВОДСТВА, СУДАЎЛАДКАВАННЕ, ПРАВАСУДДЗЕ, ГІСТОРЫЯ, БЕЛАРУСЬ, РАСІЙСКАЯ ІМПЕРЫЯ, ЗАХОДНІЯ ГУБЕРНІ, САМАДЗЯРЖАЎЕ, СТАТУТ ВКЛ 1588 Г., СУДОВАЯ РЭФОРМА 1864 Г., СУДОВЫЯ СТАТУТЫ

Эвалюцыя судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі (1772–1917 гг.) [Тэкст]: Справаздача аб НДР (заключ.): / БДПУ; кіраўн. Гушчынскі І.Г. - Мн., 2019. - 87 с., 3 іл., 1 дадатак - Бібліягр.: С. 75-85 (167 назв.). - № ДР 20190739.

**Аб’ект** – судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст.
**Мэта** – раскрыццё эвалюцыі судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі з 1772 па 1917 г.: дэталёвае апісанне сістэмы судаўладкавання, характарыстыка судаводства, выяўленне чыннікаў і зместу пераўтварэнняў расійскіх улад у сферы правасуддзя.
Даследаванне базіруецца на асноўных метадалагічных прынцыпах: гістарызм, аб’ектыўнасць і каштоўнасны падыход.
**Вынік.** абгрунтаванне этапаў эвалюцыі судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1917 гг.; выяўленне прычын і зместу пераўтварэнняў у сферы суда, якія праводзіліся тут уладамі Расійскай імперыі ў дадзены перыяд; устанаўленне мадэлі сістэмы судаўладкавання і судаводства на розных этапах іх эвалюцыі ў перыяд знаходжання краю ў складзе Расійскай імперыі.
**Ступень укаранення.** Вучэбны працэс БДПУ.
**Вобласць выкарыстання.** Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны ў адукацыйным працэсе пры выкладанні гістарычных і юрыдычных дысцыплін ва ўстановах вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, а таксама пры падрыхтоўцы падручнікаў, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і комплексаў па іх. Гістарычны вопыт пераўтварэнняў расійскага ўрада ў сферы правасуддзя на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1917 гг. можа быць запатрабаваны пры правядзенні мерапрыемстваў па рэфармаванні судовай сістэмы Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.
Вынікі дадзенай навукова-даследчай працы істотна абнаўляюць айчынную гістарыяграфію звесткамі, якія спрыяюць больш шырокаму ўяўленню і глыбокаму разуменню сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў у гісторыі беларускага народа ў перыяд знаходжання ў складзе Расійскай імперыі; садзейнічаюць актуалізацыі гістарычнага вопыту пераўтварэнняў расійскага ўрада ў сферы правасуддзя на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1917 гг.